**Пра ўзаемадачыненні Рэспублікі Беларусь і Рады Еўропы.**
**Пазіцыя Аб'яднаных дэмакратычных сіл**

Каштоўнасная аснова Рады Еўропы грунтуецца на дэмакратычным ладзе краін-чальцоў. Гэта "адданасць духоўным і маральным каштоўнасцям, якія з'яўляюцца агульным набыткам іх народаў і сапраўднаю крыніцаю прынцыпаў свабоды асобы, палітычнай свабоды і вяршэнства Права, якія ляжаць у аснове любой сапраўднай дэмакратыі" (Статут Рады Еўропы, прэамбула).

Паводле Статута Рады Еўропы, "мэтаю Рады Еўропы з'яўляецца дасягненне большага адзінства паміж яе членамі дзеля абароны і ажыццяўлення ідэалаў і прынцыпаў, якія з'яўляюцца іх агульным набыткам, і спрыянне іх эканамічнаму і сацыяльнаму прагрэсу. (…) Кожны член Рады Еўропы павінен прызнаваць прынцып вяршэнства Права і прынцып, паводле якога ўсе асобы, што знаходзяцца пад яго юрысдыкцыяй, павінны карыстацца правамі чалавека і асноўнымі свабодамі, і шчыра і актыўна супрацоўнічаць у імя дасягнення мэты Рады (…)"(Статут Рады Эўропы, арт. 1, 3).

Толькі еўрапейская дзяржава, якая здольная і імкнецца адпавядаць названым мэтам і прынцыпам, можа быць запрошаная камітэтам міністраў стаць Членам Рады Еўропы (Статут Рады Еўропы, арт. 4).

Паводле палітычнага мандата Рады Еўропы, вызначанага трэцім Самітам Кіраўнікоў Дзяржаў і Урадаў у Варшаве ў маі 2005 г., мэтамі арганізацыі з'яўляюцца:

"- абарона правоў чалавека, плюралістычнай дэмакратыі і ўлады закону;

- падтрымка ўсведамлення і заахвочванне развіцця культурнай тоеснасці і разнастайнасці Еўропы;

- пошук супольных рашэнняў праблем, з якімі сутыкаецца еўрапейскае грамадства, такіх, як дыскрымінацыя меншасцяў, ксенафобія, нецярпімасць, біяэтыка і кланаванне, тэрарызм, гандаль людзьмі, арганізаваная злачыннасць і карупцыя, кіберзлачыннасць, гвалт над дзецьмі;

- умацаванне дэмакратычнай стабільнасці ў Еўропе праз падтрымку палітычнай, заканадаўчай і канстытуцыйнай рэформы".

**Аб'яднаныя дэмакратычныя сілы Беларусі** цалкам падзяляюць каштоўнасці, мэты і прынцыпы Рады Еўропы і ставяць сваёй мэтай іх увасабленне ў нашай краіне.

**Аб'яднаныя дэмакратычныя сілы** канстатуюць, што цяперашнія ўлады Беларусі ў сваёй заканадаўчай дзейнасці і правапрымяняльнай практыцы сістэматычна супярэчаць каштоўнасцям, мэтам і прынцыпам Рады Еўропы, груба парушаючы правы чалавека і асноўныя свабоды, у тым ліку палітычныя.

Мы разглядаем перспектыву прыняцця Беларусі ў Члены Рады Еўропы як інструмент, шанец і стымул для вяртання дэмакратыі ў нашу краіну.

Аднак безумоўнае запрашэнне ў гэтую міжнародную арганізацыю без унутраных сістэмных зменаў у краіне, пры захаванні цяперашніх антыдэмакратычных закандаўства і практыкі яго ўжывання, толькі закансервуе і нават пагоршыць становішча ўнутры Беларусі, прывядзе да размывання крытэраў членства ў Радзе Еўропы да сітуацыі падвойных стандартаў.

Таму для рэалізацыі гэтай мэты патрэбныя ясныя для ўсіх бакоў стратэгічныя прынцыпы, з якіх вынікаюць практычныя захады.

**1.** Мы падтрымліваем прапанову Палітычнага камітэта Парламенцкай Асамблеі Рады Еўропы для забеспячэння ўсебаковасці, аб'ектыўнасці і празрыстасці дыялога з Беларуссю стварыць на парытэтнай аснове з прадстаўнікоў уладных структур і дэмакратычных сіл экспертную групу. Лічым неабходным і прапануем ПАРЭ распрацаваць рэгламент дзейнасці групы з механізмам публічнай справаздачнасці.

**2.** Прапануем даручыць названай групе на працягу 4 месяцаў распрацаваць "падарожную карту", г.зн. каляндарны паэтапны план набліжэння да мэты.

**3.** Вяртанне Рэспублікі Беларусі статусу спецыяльна запрошанай у РЕ краіны , а ў далейшай перспектыве наданне ёй поўнага членства ў РЕ, магчымае толькі ў адпаведнасці з арт. 4 Статута РЕ, г.зн. улады Беларусі павінны выявіць здольнасць і імкненне адпавядаць мэтам і прынцыпам арганізацыі. Таму:

**3.1.** Для пачатку перамоў аб вяртанні статусу спецыяльна запрошанай краіны неабходна пачаць змены палітычнай атмасферы ў кірунку даверу, для чаго вызваліць усіх палітычных вязняў (зняволеных паводле палітычных матываў), адмяніць наступствы ўсіх іншых рэпрэсіўных захадаў палітычнага характару (звальненні з працы і выключэнне з універсітэтаў, гвалтоўны прызыў у войска непрыдатных да службы, забарона друку і продажу ўсёй незалежнай прэсы), скасаваць або прынамсі накласці мараторый на смяротнае пакаранне.У ходзе перамоў улады павінны прадэманстраваць

здольнасць і імкненне адпавядаць мэтам і прынцыпам РЕ, узяўшы на сябе акрэсленыя ў часе абавязкі і на практыцы распачаўшы сфармуляваныя Аб'яднанымі дэмакратычнымі сіламі змены ў выбарчым заканадаўстве, заканадаўстве аб мас-медыях і свабодзе выказвання, крымінальным заканадаўстве, заканадаўстве аб дзейнасці грамадскіх, палітычных, прафсаюзных, рэлігійных арганізацый, а таксама спыніўшы дыскрымінацыю грамадзянаў паводле моўна-культурнай прыкметы.

**3.2.** Перамовы аб вяртанні статусу спецыяльна запрошанай у РЕ краіны павінны мець вынікам падпісанне Беларуссю:

- Канвенцыі абароны правоў і асноўных свабодаў і такім чынам прызнанне ёю юрысдыкцыі Еўрапейскага суду па правах чалавека;
- Еўрапейскай Хартыі мясцовага самакіравання.

Падпісанне мае на ўвазе адаптацыю нацыянальнага заканадаўства да названых дакументаў.

**3.3.** Правядзенне выбараў усіх узроўняў паводле стандартаў АБСЕ.

**4**. Запрашэнне Беларусі стаць Членам Рады Еўропы адбываецца пасля вычарпальнага выканання пп. 1-3.

**Ухвалена Прэзідыумам АДС 15 красавіка 2009 г.**